ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (807) ● Чацвер, 1 красавіка 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV




ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ З'ЕЗДА

## НАЙВЫШЭЙШАЕ ШЧАСЦЕ

Мы пераступаем парог дзевятай пяцігодкі — новага важнага этапу нашага шляху да камунізма. Галоўная задача пяцігодкі — зрабіць жыццё савецкіх людзей яшчэ лепшым, багацейшым, цікавейшым. Аб тым узроўні, на які павінна падняцца наша краіна ў бліжэйшым будучым, красамоўна гавораць лічбы праекта Дырэктыў XXIV з'езда партыі. Тут жа можна знайсці адказ на пытанне, за кошт чаго будзе дасягнут гэты ўзровень: за кошт высокіх тэмпаў развіцця сацыялістычнай вытворчасці.

Роля навукі ў здзяйсненні грандыёзных планаў новай пяцігодкі надзвычай вялікая. Бадай, няма ні адной галіны народнай гаспадаркі, развіццё якой было б магчыма сёння без матэматычных метадаў планавання, без выкарыстання вылічальнай тэхнікі, электронікі і іншых дасягненняў нашага веку. Мне прыемна усведамляць, што навука, якую я прадстаўляю — матэматыка, — усё больш пранікае ва ўсе сферы сучаснага жыцця. Дзякуючы ёй мы стаім на парозе рэвалюцыі ў арганізацыі планавання, у рашэнні многіх навукова-тэхнічных задач.

Але неабходны яшчэ немалыя намаганні ў правільнай арганізацыі навуковай справы з тым, каб узяць найбольшую карысць з кожнага адкрыцця.

Дасягненні беларускіх вучоных уносяць важкі ўклад у развіццё савецкай навукі. Шырока вядомы работы нашых даследчыкаў у галіне квантавай электронікі, тэорыі цепла- і масаабмену, тэхнічнай кібернетыкі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, матэматыкі і іншых навуковых напрамкаў. Беларускія вучоныя не стаяць у баку ад задач, якія пашаюцца ў агульнанародным маштабе, і наш удзел у гэтай вялікай рабоце будзе яшчэ больш актыўным у новай пяцігодцы.

Яе планы настолькі грандыёзныя, настолькі захапляючыя, што мне хочацца без усякай скідкі на ўзрост папрацаваць над іх здзяйсненнем. Гэта—найвышэйшае шчасце для кожнага савецкага чалавека.

**М. ЯРУГІН,**
**акадэмік АН БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў ФПМ.**




Напярэдадні з'езда партыі ва універсітэце адбылося многа цікавых сустрэч з ветэранамі грамадзянскай і Айчыннай вайнаў, перадавікамі вытворчасці, кіраўнікамі партыйных і савецкіх устаноў.

**На здымку:** сярод студэнтаў фізічнага факультэта дэлегат III з'езда камсамола **Я. С. Балакін.** Фота **Г. Марозава.**

**Г. БЯГУН.**

### СЭРЦА МІЛЬЁНАЎ

Таварыш Партыя,
твой розум і сумленне —
Зямны арыенцір,
сузор'і-маякі.
Ты — рулявы,
ты — волат апалчэння,
Што новы шлях
пракладвае ў вякі.
Таварыш Партыя,
ты — сэрца мільёнаў,
Надзейны авангард
нашчадкаў Ільіча.
Гартуй рады
у рытме будняў плённых.
Маё плячо —
каля твайго пляча.
Таварыш Партыя,
у працы, ў строфах верша
Я крокі на цябе
раўняю, як салдат.
Я стаў у строй
у грозным сорак першым
І праз гады
быў твой адданы брат.
Таварыш Партыя,
сняжынкі беляць скроні:
Даўно жыву
адным жыццём з табой.
Як на вайне,
зноў прысягаю сёння
За справу Леніна
ісці заўсёды ў бой.

## ПАСПЯХОВАСЦЬ — ГАЛОЎНЫ КЛОПАТ

Павышэнне паспяховасці студэнтаў па французскай і іспанскай мовах заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўсёй работы кафедры. І не выпадкова іменна гэты пункт быў адным з галоўных у сацыялістычных абавязацельствах, прынятых кафедрай да XXIV з'езда нашай партыі.

Для яго выканання кафедра зрабіла ў гэтым навучальным годзе значную работу. На пасяджэннях неаднаразова заслухоўваліся справаздачы выкладчыкаў аб паспяховасці студэнтаў. Рэгулярна па графіку праводзяцца дадатковыя заняткі са студэнтамі малодшых курсаў і кансультацыі для старшакурснікаў, якія працуюць над перакладамі арыгінальнай спецыяльнай літаратуры.

Поўнасцю перапрацаваны семестравыя рабочыя планы, вызначан аб'ём патрабаванняў да залікаў і экзаменаў. Перагледжаны распрацоўкі да вусных тэм, праверany і палепшаны гуказапісы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, выкарыстоўваемых у навучальным працэсе. Наладжана работа з трэнажорамі. У час лабараторных работ выкарыстоўваюцца прагграміраваныя дапаможнікі, створаныя кафедрай, дэманструюцца фільмы, якія знаёмяць студэнтаў з краінай вывучаемай мовы.

Пазааўдыторная работа вядзецца ў гуртку гутарковай мовы. Студэнты прыцягваюцца да арганізацыі вечароў на замежных мовах. Адзін з іх адбыўся нядаўна і быў прысвечан 100-годдзю Парыжскай Камуны. Удзельнікамі яго былі некалькі соцень студэнтаў, вывучаючых французскую мову.

У кабінеце рэгулярна абнаўляюцца стэнды, прысвечаныя знамянальным датам у нашай краіне і ў Францыі, вывешваюцца найбольш цікавыя артыкулы з газет «Маскоўскія навіны» і «Юманітэ», наладжваюцца выстаўкі новых кніг і часопісаў на французскай і іспанскай мовах.

Усе выкладчыкі кафедры працуюць рэгулярна над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню, навукова-тэарэтычнай і прафесіянальнай кваліфікацыі. Ужо некалькі год запар на кафедры працуе тэарэтычны семінар, у якім выкладчыкі прымаюць актыўны ўдзел. З 15 членаў кафедры двое павышалі сваю кваліфікацыю ў Францыі, чацвёра ў Маскве і чацвёра на факультэце павышэння кваліфікацыі ў Мінскім інстытуце замежных моў.

За апошнія гады выкладчыкі выдалі пяць вучэбных дапаможнікаў па французскай мове агульным тыражом 37 друкаваных аркушаў. Цяпер калектывам падрыхтаван да друку падручнік французскай мовы ў аб'ёме 12 друкаваных аркушаў, які будзе выдадзен у 1972 годзе.

**М. ПОЛАЗАЎ,**
**дацэнт.**

## Лектары— з'езду

З вялікай цікавасцю сочаць за работай з'езда партыі выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі.

Лектары БДУ адзначылі знамянальную падзею ў жыцці нашага народа шэрагам выступленняў у масавай аўдыторыі. У дзень адкрыцця з'езда адбылася сустрэча калектыву кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі з партыйна-гаспадарчым актывам Смалявіцкага раёна. Гутарка ішла па актуальных праблемах сучаснасці і аб перспектыўным плане развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі раёна. Брыгада лектараў выступіла ў Салігорску, запланаваны выезды ў Барысаў, Дзяржынск, Бабруйск.

## АБАВЯЗАЛІСЯ—ВЫКАНАЛІ

**Камітэт ДТСААФ універсітэта падвёў вынікі выканання перадз'ездаўскіх абавязацельстваў па ваенна-патрыятычнай і абаронна-масавай рабоце. Усе намечаныя планы выкананы поўнасцю. Вялікая работа зроблена ў перыяд месячніка абаронна-масавай работы. Праведзена 12 тэматычных вечароў, 15 вечароў сустрэч з Героямі Савецкага Саюза і ветэранамі войнаў, больш 300 лекцый і гутарак па ваенна-патрыятычнай тэматыцы. Студэнты былі гасцямі воінскіх часцей ЧБВА, наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, зрабілі паходы па месцах баёў у Беларусі, удзельнічалі ў спаборніцтвах па ваенна-прыкладных відах спорту. Каманда дзяўчат у саставе Г. Ярмоленка, С. Вараб'евай, І. Гарадзецкай, В. Корзун, Н. Сідарэнка і Г. Брылеўскай заняла першае месца на гарадскіх спаборніцтвах па кулявой стральбе. Мужчынская універсітэцкая каманда (капітан Ю. Лебедзеў) заняла другое месца па кулявой стральбе сярод каманд Кастрычніцкага раёна.**

**Датэрмінова выканан шэраг іншых абавязацельстваў. У выніку універсітэцкая арганізацыя ДТСААФ заняла першае месца ў Кастрычніцкім раёне. Найбольшых поспехаў дабіліся наступныя арганізацыі ДТСААФ:**

**фізічнага факультэта (старшыня камітэта А. І. Куляшоў). Тут праведзена больш 30 гутарак і лекцый, тры вечары сустрэч з ветэранамі войнаў. Асабліва добра быў арганізаван тэматычны вечар «Баявыя сцягі расказваюць», на якім выступілі ўдзельнік партызанскага руху ў Беларусі С. Г. Сідарэнка-Салдаценка, удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці П. Е. Сівакоў, Герой Савецкага Саюза генерал-маёр у адстаўцы А. В. Кірсанаў, афіцэры падшэфнай часці, выкладчыкі кафедры. На факультэце добра аформлена наглядная агітацыя. Зборная каманда па кулявой стральбе (трэнер студэнт П. Цюрыкаў) заняла першае месца ў спаборніцтвах сярод факультэтаў.**

**геаграфічнага факультэта (старшыня А. Д. Плятнёў), дзе разам з добрай арганізацыяй ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў на высокім узроўні арганізатарская работа. Датэрмінова выканан гадавы план уплаты членскіх узносаў;**

**хімічнага факультэта (старшыня М. Г. Рафальскі). Тут паспяхова вядзецца ваенна-патрыятычная работа. Заслугоўвае асаблівай пахвалы гурток кулявой стральбы, якім кіруе палкоўнік у адстаўцы Ф. Ф. Церашонак. Добра дзейнічае парашутны гурток, якім кіруе студэнт В. Доктараў.**

**Прыкметна ажывілася работа ў арганізацыях ДТСААФ і іншых факультэтаў. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва месцы размеркаваліся наступным чынам: І — фізічны, ІІ — геаграфічны, ІІІ — хімічны. Далей ідуць біялагічны, матэматычны, гістарычны, факультэт прыкладной матэматыкі, філалагічны, факультэт журналістыкі, юрыдычны факультэт.**

**М. ГАРЛАТАЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ БДУ.**

## ФАКУЛЬТЭТ АБ САБЕ

Калі б вы ўпершыню трапілі ў гэты цудоўны вучэбны корпус і не ведалі, на якім факультэце знаходзіцеся, то толькі па нагляднай агітацыі без усялякай цяжкасці маглі б вызначыць, што вы ў хімікаў. Ужо ў прасторным вестыбюлі першага паверха кідаецца ў вочы з густам аформленая выстаўка «Хімічная прамысловасць Беларусі». Тут здымкі гродзенскіх завода капралактаму і агульны выгляд цэха аміяку, азотнатукавага камбіната, гмахаў Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна і г. д. Цікавы фотакадр — «У забоі Салігорскага калійнага камбіната» і іншыя. У час перапынкаў каля выстаўкі заўсёды студэнты.

Падымаемся на другі паверх. Тут прыцягвае ўвагу вялікі стэнд — «Хімічны факультэт насустрач XXIV з'езду КПСС». Пазнаёмішыся са зместам інфармацый аб рабоце кафедр і лабараторый, з майстэрскі выкананымі фотаздымкамі, даведваецся пра поспехі факультэта, пра тыя працоўныя падарункі, якія падрыхтавалі да адкрыцця з'езда партыі вучоныя-хімікі, выкладчыкі, студэнты. А такія падарункі сапраўды значныя. У 1970 годзе вучоныя факультэта апублікавалі 126 навуковых прац (43 у 1966 годзе). Гэты поспех ілюструе на стэндзе спецыяльная дыяграма.

Факультэт усё цясней звязваецца з вытворчасцю, выконвае шматлікія заказы хімічных прадпрыемстваў. Аб гэтым расказваецца ў інфармацыі пра кафедру нафтахіміі, якую ўзначальвае прафесар Д. М. Андрыеўскі.

На стэндзе знайшлі адлюстраванне навуковая праца студэнтаў, клопаты вядучых вучоных аб выхаванні маладых навуковых кадраў. Гэта відаць з кампазіцый, прысвечаных кафедры хіміі высокамалекуля р н ы х злучэнняў, кафедры агульнай хіміі і г. д. Тут жа, не адыходзячы далёка, можна ўбачыць партрэты студэнтаў-выдатнікаў.

А на трэцім паверсе новы стэнд. Тут аддадзена даніна павагі членам калектыву хімфака, якія са зброяй у руках змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Мы бачым вайсковыя і цывільныя фатаграфіі прафесара І. Р. Цішчанкі, былога тэхніка-лейтэнанта; супрацоўніка факультэта, падпалкоўніка медыцынскай службы ў адстаўцы А. К. Артамонава, дацэнта кафедры аналітычнай хіміі Н. А. Поляк, былой партызанскай сувязной і інш.

Агульнае ўражанне аб нагляднай агітацыі хімічнага факультэта можна выказаць коратка: змястоўна і ўражліва.

Іншыя факультэты маглі б пераняць у хімікаў лепшае ў афармленні нагляднай агітацыі і папоўніць свае экспазіцыі новымі матэрыяламі XXIV з'езда КПСС і да 50-годдзя нашага універсітэта.

**У. КУЛАЖАНКА.**



**На здымках:** ідзе лекцыя па судовай медыцыне на IV курсе юрыдычнага факультэта. Чытае асістэнт кафедры судовай медыцыны Уладзімір Ільіч Нізаўцаў.

Фота **Д. Чаховіча.**



# ШТРЫХІ ВУЧЭБНЫХ БУДНЯЎ

Лекцыі, семінары, практычныя заняткі... Іменна гэтым запоўнены будні студэнтаў. Красавік — набліжэнне сесіі. З чым жа ідуць студэнты насустрач экзаменам і залікам? У адзін са звычайных вучэбных дзён наш карэспандэнт сустрэўся са старастай першай групы II курса гістарычнага факультэта Ларысай Новік і папрасіў яе расказаць аб поспехах і цяжкасцях бягучага семестра.

**— Па выніках зімовай сесіі ваша група заняла першае месца па паспяховасці. Цяжка даўся гэты поспех?**

— Вельмі цяжка. Даводзілася здаваць чатыры экзамены і тры тэарэтычныя залікі. Падрыхтаваліся, відаць, нядрэнна. Напрыклад, пасля здачы гісторыі БССР толькі ў аднаго студэнта паявілася двойка. Затое ў 19 залікоўках былі пастаўлены пяцёркі. Гэта своеасаблівы рэкорд.

**— Як праходзяць семінары цяпер?**

— Даволі жыва, але ў групе ёсць студэнты пастаянна актыўныя і такія, што адбываюць акадэмічныя гадзіны. Я б растлумачыла гэтую пасіўнасць рознымі прычынамі. У нас многа або, дакладней, асноўная частка студэнтаў ва універсітэт прыйшлі адразу пасля школы. Не хачу пакрыўдзіць большасць рабят, але некаторыя выбіралі прафесію па жаданню прадбачлівых бацькоў. Не захопленыя выбранай навукай, яны сумуюць на лекцыях, пасіўнічаюць на семінарах.

**— Ці ёсць цяжкасці пры падрыхтоўцы да семінараў?**

— Заўсёды цяжка і многае незразумела, калі прапусціў лекцыю і пасля даводзіцца рыхтавацца да семінара па прапушчанай тэме. Толькі гэта можа быць прычынай складанасцей. А так — было б толькі жаданне займацца, усё да тваіх паслуг: кабінеты свабодныя, падручнікаў і розных дапаможнікаў хапае, у чытальных залах месцы ёсць.

**— Ларыса, а як у вас у групе з наведваннем?**

— Калі глядзець на групу ў цэлым, то хвалявацца няма чаго. Наведванне добрае. Але бывае, што адзін чалавек у тыдзень прапусціць столькі вучэбнага часу, што ствараецца ўражанне, нібы палова студэнтаў групы не з'явілася на заняткі. Вось Уладзімір Іваноў, напрыклад, у гэтым семестры ўмудрыўся прапусціць 52 гадзіны лекцыйных і практычных заняткаў. Не адзін раз яго выклікалі на пасяджэнне камсамольскага бюро і сходы, але ён не з'яўляўся. Па-мойму, гэта маладушнасць і непавага да таварышаў.

Воблік групы вызначаецца кожным, яго дысцыплінаванасцю, адносінамі да вучобы, да грамадскіх спраў. І зусім не асабістая справа, як ты рыхтуешся да семінараў або наведваеш заняткі.

**І. КАМАРОЎСКІ.**

# СПРОБА СІЛ

Вось ужо некалькі год на кафедры тэорыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта працуе навуковы гурток, якім кіруе доктар юрыдычных навук прафесар Мірза Масэсавіч Авакаў. Каля 30 студэнтаў спрабуюць тут свае сілы ў навуковых даследаваннях. Ядро гуртка састаўляюць у асноўным студэнты 4 курса.

Цікавая і разнастайная праграма работы гуртка. Тут рыхтуюцца і чытаюцца даклады, абмяркоўваюцца многія сучасныя міжнародныя праблемы, рэцэнзіруюцца кнігі. Змястоўнымі, напрыклад, былі выступленні студэнткі IV курса С. Гайковай на тэму. «25 год Арганізацыі Аб'яднаных Нацый», І. Кулакоўскага і Т. Букраба — «Прававое становішча марской справы», К. Савіцкага — «Адказнасць ваенных злачынцаў у міжнародным праве» і іншыя. Цікава прайшло і абмеркаванне падручніка Д. І. Кудраўцава «Асновы міжнароднага права».

Адно з пасяджэнняў гуртка было прысвечана абмеркаванню праекта Дырэктыў XXIV з'езда КПСС.

Пры падрыхтоўцы дакладаў і рэфератаў удзельнікі навуковага гуртка выкарыстоўваюць не толькі літаратуру бібліятэк, але і матэрыялы Міністэрства замежных спраў БССР.

**Л. ВАСІЛЕЎСКІ, М. МАРЧАНКА,**
**студэнты IV курса юрфака.**



*Лабараторныя заняткі па электрафізічных уласцівасцях паўправаднікоў.*

*На здымку: студэнт IV курса хімфака Нгуен Ван Нонг.*

*Фота Д. Чаховіча.*

## У ЦЭХАХ ДРУКАРНІ

Нядаўна студэнты першага курса факультэта журналістыкі зрабілі цікавую экскурсію ў друкарню выдавецтва ЦК КПБ. Супрацоўнікі друкарні паказалі студэнтам, як робіцца кліша, як прымаюцца па фотатэлеграфе цэнтральныя газеты, расказалі аб канструкцыі лінатыпных і друкарскіх машын, пазнаёмілі з некаторымі асаблівасцямі работы ў кніжным цэху.

**І. СЦЯПУРА.**

# ДОЎГ КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

**Грамадзянская абарона ў СССР з'яўляецца не толькі сістэмай агульнадзяржаўных абаронных мерапрыемстваў, але і ўсенароднай справай. Кожны савецкі чалавек абавязан актыўна ўдзельнічаць у правядзенні мерапрыемстваў грамадзянскай абароны, выконваючы свой свяшчэнны доўг па абароне Радзімы.**

**У сёлетнім навучальным годзе з мэтай удасканалення ведаў і практычных навыкаў з супрацоўнікамі і аспірантамі універсітэта праводзяцца заняткі па 21-гадзіннай праграме, якая ўключае наступныя важнейшыя тэмы: спосабы абароны ад зброі масавага паражэння; дзеянні насельніцтва пры пагрозе нападзення праціўніка і па сігналу «Паветраная трывога»; правілы паводзін і дзеянні ў раёнах радыёактыўнага, хімічнага і бактэрыялагічнага заражэння; аказанне самадапамогі і ўзаемадапамогі.**

**Для правядзення заняткаў у вучэбных групах на факультэтах, кафедрах, у лабараторыях і аддзелах у снежні 1970 года штабам грамадзянскай абароны падрыхтаваны кіраўнікі. У бягучым навучальным годзе ад усіх супрацоўнікаў і аспірантаў будуць прыняты залікі, для правядзення якіх загадам рэктара назначана камісія. У яе састаў уключаны выкладчыкі кафедры грамадзянскай абароны, ваеннай кафедры, медперсанал здраўпункта, прадстаўнікі арганізацый ДТСААФ, Чырвонага Крыжа, а таксама актывісты грамадзянскай абароны.**

**Нядрэнна арганізавана навучанне на матэматычным факультэце, у вылічальным цэнтры, на ваеннай кафедры, у праблемнай лабараторыі эксперыментальнай біялогіі і лабараторыі хіміі рэдкіх і цяжкіх элементаў. Аднак да гэтай пары вучоба не распачата на хімічным, юрыдычным, падрыхтоўчым факультэтах, факультэтах журналістыкі і прыкладной матэматыкі, на кафедрах англійскай і нямецкай моў, палітэканоміі, гісторыі КПСС, навуковага камунізма, у выдавецтве і друкарні, а таксама ў радзе груп фізічнага і філалагічнага факультэтаў і гаспадарчай часткі. На некаторых факультэтах спрабуюць арганізаваць заняткі з усімі супрацоўнікамі і аспірантамі адначасова, а не па вучэбных групах, што прыводзіць да нізкага наведвання.**

**Кіраўнікам факультэтаў, кафедр, лабараторый і аддзелаў неабходна прыняць усе меры для забеспячэння максімальнай наведваемасці заняткаў, завяршэння навучання і прыёму залікаў да пачатку летняй сесіі, а таксама садзейнічаць актыўнаму ўдзелу супрацоўнікаў і аспірантаў універсітэта ва ўсіх мерапрыемствах грамадзянскай абароны.**

**В. КАСАЧОЎ,**
**начальнік штаба грамадзянскай абароны БДУ.**



*У студэнтаў-дыпломнікаў цяпер самая напружаная пара: да абароны работ засталося крыху больш двух месяцаў.*

*Актыўна працуе над дыпломнай тэмай у адной з лабараторый Інстытута фізікі АН БССР выпускнік фізічнага факультэта ленінскі стыпендыят Георгій Сініцын.*

*НА ЗДЫМКУ: Георгій СІНІЦЫН (стаіць) са сваім кіраўніком Фёдарам Уладзіміравічам КАРПУШКАМ за работай.*

*Фота Ю. МАКАРАВА, студэнта фізфака.*

# БАГАЦЦІ НЕЎМІРУЧЫЯ

Літаратуразнаўцы, выкладчыкі зарубежнай літаратуры і, вядома, студэнты з цікавасцю пазнаёмяцца з «Літаратурай Усходу ў сярэднія вякі» — двухтомнай працай, выдадзенай Маскоўскім універсітэтам пад рэдакцыяй вядомых вучоных-усходазнаўцаў Н. І. Конрада, І. С. Брагінскага, Л. Д. Пазднеевай. Аўтары гэтай каштоўнай работы імкнуліся раскрыць багацце і шматграннасць літаратур Усходу, паказаць складанасць тых умоў, у якіх жылі і працавалі паэты і пісьменнікі розных краін, ствараючы свае бессмяротныя творы. Напісаныя многа стагоддзяў таму назад, яны і сёння ўражваюць нас сваёй непаўторнай мудрасцю.

Двухтомнік знаёміць чытача з лірыкай арабаў і цюркаў, з паэзіяй намёку японскай танкі і кітайскіх «абарваных радкоў». Тут ён знойдзе характарыстыку творчасці вялікіх паэтаў Абу-ль-Аля, аль-Маары, Фірдоусі, Амар Хайяма, Саадзі, Хафіза, Кабіра, Тульсідаса, Лу Бо, Ду Фу і іншых, аналіз такіх помнікаў, як цыкл арабскіх казак «Тысяча і адна ноч», аповесць аб бліскучым японскім прынцу Гэндзі, народныя кнігі аб Хаджы Насрэдзіне і аб кітайскіх паўстанцах.

Асаблівую ўвагу аўтары двухтомніка ўдзяляюць традыцыям вуснай народнай творчасці, а таксама апазіцыйным у адносінах да дагматаў феадалізму плыням мастацкай думкі, праблемам суадносін народнасці і гуманізму.

**Р. БРАГІН,**
**выкладчык кафедры зарубежнай літаратуры.**

# ПОШУКІ Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ

Штогод на базе хімічнага факультэта універсітэта праводзіцца абласная алімпіяда юных хімікаў. Асноўныя задачы яе — павышэнне інтарэсу да вывучэння хіміі, падвядзенне вынікаў работы факультатываў, гурткоў, секцый і актывізацыя ўсіх форм пазакласнай і пазашкольнай работы з вучнямі па хіміі, аказанне дапамогі старшакласнікам у выбары прафесіі. Сёлетняя алімпіяда праводзілася напярэдадні пятай Усесаюзнай алімпіяды юных хімікаў, якая адбудзецца на беларускай зямлі з 15 па 21 красавіка. Тры дні ва універсітэцкіх аўдыторыях працавалі 142 вучні гарадскіх і сельскіх школ 7—10 класаў.

Усю работу па арганізацыі і правядзенні алімпіяды ўзначалілі дэкан хімічнага факультэта Ф. М. Капуцкі і дацэнт А. Р. Улазава. Пад іх кіраўніцтвам 28 выкладчыкаў розных кафедр склалі разліковыя задачы і практычныя работы, а пасля прысутнічалі пры рашэнні іх, правяралі работы вучняў. Практычная частка праграмы выконвалася ў факультэцкіх лабараторыях.

Алімпіяда паказала, што школьнікі сур'ёзна рыхтаваліся да III тура. Разліковыя і практычныя задачы ахаплівалі вывучаны праграмны матэрыял, але патрабавалі лагічнага роздуму і markнабаковага падыходу да рашэння. Неабходна было дакладна ўлічваць уласцівасці канкрэтных рэчываў, магчымыя іх узаемадзеянні і пераўтварэнні, умовы працякання рэакцый, выходзячы з даных кожнай задачы.

Члены аргкамітэта, выкладчыкі хімфака Л. С. Станішэўскі, Т. П. Адамовіч, Л. І. Севасцьянава і С. А. Мячкоўскі глыбока прааналізавалі рашэнні задач і прыйшлі да вываду, што многія вучні ўмеюць сур'ёзна працаваць, мысліць лагічна, даказваць выбраны спосаб рашэння.

Журы вызначыла 15 пераможцаў алімпіяды, якім уручаны граматы і прызы. Трое занябўшых першыя месцы накіроўваюцца для ўдзелу у чацвёртым туры алімпіяды, які адбудзецца ў г. Мінску. Гэта Мікалай Звонак — вучань 10 класа Клецкай СШ (настаўніца Р. М. Доўбыш); Сяргей Цярэшчанка — 9 клас, СШ № 7 г. Маладзечна; Аляксандр Блінкоўскі — вучань гэтай жа школы (выкладчык Г. І. Корсак, выдатнік народнай адукацыі). Другія месцы занялі Валерый Лашук — вучань 8 класа Стаўбцоўскай СШ № 2, Таня Булайчык — 8 клас Каменнаборскай СШ Бярэзінскага раёна і Уладзімір Шаблоўскі — 10 клас Дзяржынскай СШ № 1. З самых юных удзельнікаў (7 клас) першае месца заваявала Валянціна Сяргеева — вучаніца СШ № 4 г. Жодзіна, другое месца—вучаніца Горкаўскай СШ Старадарожскага раёна Зоя Зражэўская.

Для многіх вучняў школ Мінскай вобласці хімія стала любімым прадметам і вызначыла выбар будучай спецыяльнасці. Сярод студэнтаў хімфака нямала такіх, чыё захапленне навукай зарадзілася яшчэ ў школе. Так, у мінулым годзе на выдатна здалі ўступныя экзамены на хімфак удзельнікі абласной і ўсесаюзнай алімпіяд браты Іван і Пётр Мардзіловічы, выпускнікі Стаўбцоўскай СШ № 2. Першая студэнцкая сесія для іх была таксама паспяховай. Заканчваюць універсітэт прайшоўшыя школу алімпіяд Алег Баран і Генадзь Пятроў, на IV курсе займаецца Аляксандр Звонак, а Канстанцін Лайко — стажор-даследчык на хімфаку. Гэта толькі некалькі прыкладаў.

Пасля падвядзення вынікаў алімпіяды старшы выкладчык кандыдат хімічных навук БДУ А. І. Леснікові і дацэнт Л. С. Станішэўскі правялі з вучнямі экскурсію па лабараторыях хімічнага факультэта.

У арганізаваным правядзенні абласной алімпіяды вельмі вялікую ролю адыграў калектыў выкладчыкаў хімічнага факультэта універсітэта, якому ўсе ўдзельнікі і арганізатары выказваюць сваю шчырую падзяку.

**А. КАЛЕВІЧ,**
**загадчык кабінета хіміі Мінскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў.**

# У ШТАБЕ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

На чарговым пасяджэнні штаба працоўных спраў СБА універсітэта абмеркавана правядзенне дагаворнай кампаніі і фарміраванне атрадаў. Лепшай была прызнана работа штабаў фізічнага (начальнік А. Курловіч) і гістарычнага (начальнік В. Вайц) факультэтаў.

Нездавальняючай на першым этапе падрыхтоўчага перыяду аказалася работа штабаў працоўных спраў матэматычнага факультэта (начальнік І. Мазалеўскі) і факультэта прыкладной матэматыкі (начальнік В. Курыленкаў). Тут дрэнна рашаюцца арганізацыйныя пытанні, у тэрмін не закончана дагаворная кампанія, адсутнічае наглядная агітацыя. Па віне гэтых факультэтаў зрываецца вучоба камісараў лінейных атрадаў. Усе гэтыя недахопы камсамольскім арганізацыям матфака і ФПМ неабходна тэрмінова выправіць.

У сувязі з пастановай абласнога штаба СБА аб укамплектаванні лінейных атрадаў тэхнічна адукаванымі спецыялістамі вырашана выдзеліць па тры чалавекі з кожнага атрада, якія павінны прайсці навучанне на базе БТІ. Заняткі праводзяцца кожную сераду з 19 гадзін.

Намячаючы канкрэтныя мерапрыемствы па культурна-масавай і палітыка-выхаваўчай рабоце на падрыхтоўчы і працоўны перыяд, штаб СБА універсітэта прапанаваў кожнаму атраду прыняць сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар 50-годдзя універсітэта.

Аб'яўлен конкурс на лепшую эмблему атрада, а таксама на лепшую атрадную насценгазету ў падрыхтоўчы перыяд. Вынікі конкурсу будуць падведзены да 1 мая. У сярэдзіне мая будзе праведзен конкурс і на лепшую агітбрыгаду, і лектарскую групу.

Адной з асноўных задач СБА ў падрыхтоўчы перыяд з'яўляецца своечасовы медыцынскі агляд. Цяпер жа графік медагляду парушаецца атрадамі юрыдычнага і хімічнага факультэтаў. Камандзіры атрадаў дрэнна кантралююць парадак праходжання прывівак і прафілактычнага агляду. Каб захаваць рытмічнасць работы медпункта ў дні агляду, факультэты павінны выдзеліць аднаго дзяжурнага з ліку камандзіраў СБА.

З мэтай далейшага паляпшэння работы ўсіх звенняў СБА пасяджэнні штаба будуць праводзіцца кожны тыдзень па панядзелках.

**У. СІЛІН,**
**начальнік штаба працоўных спраў БДУ,**
**У. РАССОХІН,**
**камісар.**

# З ПАСТАНОВЫ РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БДУ

**Лічыць галоўным напрамкам працоўнага семестра 1971 года ўдзел студэнтаў у сельскім будаўніцтве, электрыфікацыі сёл, калгасаў і саўгасаў, у рабоце па меліярацыі зямель і на ўдарных камсамольскіх будоўлях.**

**Важнейшай задачай студэнцкіх будаўнічых атрадаў па-ранейшаму з'яўляецца будаўніцтва і шэфства над сельскімі школамі. Неабходна, каб кожны атрад дакладна вызначыў свой уклад у выкананне праграмы ўсесаюзнай двухгодкі «Камсамол — сельскай школе».**

**Катэгарычна забараніць фарміраванне і выезд груп студэнтаў у раёны, не прадугледжаныя планам фарміравання і дыслакацыі рэспубліканскага атрада 1971 года. Абавязаць партбюро, дэканаты, камітэты камсамола і прафбюро праводзіць растлумачальную работу сярод студэнтаў з мэтай ліквідавання «дзікіх» атрадаў і прыцягваць да строгай партыйнай, адміністрацыйнай і камсамольскай адказнасці студэнтаў, не выканаўшых гэты пункт пастановы.**

**Абавязаць штаб працоўных спраў універсітэта і штабы студэнцкіх будаўнічых атрадаў факультэтаў да 11 красавіка вызначыць фронт работ студэнцкіх атрадаў і закончыць заключэнне дагавораў, не пазней 1 мая правесці вучобу і прыём залікаў ва ўсіх удзельнікаў працоўнага семестра па правілах тэхнікі бяспекі.**

**Дэканатам факультэтаў для студэнтаў, якія будуць прымаць удзел у летніх работах, скласці графікі здачы экзаменаў і залікаў такім чынам, каб яны мелі магчымасць заканчваць вучэбны семестр не пазней 20 чэрвеня.**

**Камандзіраваць, па неабходнасці, з захаваннем заработнай платы па асноўным месцы работы выкладчыкаў, аспірантаў і іншых супрацоўнікаў універсітэта ў раёны работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў для акавання дапамогі ў арганізацыі выхаваўчай работы, абагульнення іх вопыту.**

**Кафедры фізвыхавання і праўленню студэнцкага клуба забяспечыць на тэрмін выезду студэнцкія будаўнічыя атрады неабходным інвентаром.**

**Медпункту універсітэта забяспечыць своечасовае правядзенне прафілактычных аглядаў і неабходных прывівак. Забяспечыць студэнцкія будаўнічыя атрады за кошт сродкаў універсітэта медыкаментамі і перавязачнымі матэрыяламі.**

**За членамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў, якія атрымліваюць стыпендыю, захаваць яе на час летніх канікул.**

**Студэнтаў, якія працуюць у саставе будаўнічых атрадаў, не прыцягваць у бягучым годзе да якіх-небудзь работ, не звязаных з навучальным працэсам.**

**Аддзелу капітальнага будаўніцтва і аддзелу забеспячэння садзейнічаць забеспячэнню студэнцкіх будаўнічых атрадаў неабходнымі інструментамі, інвентаром, спецадзеннем.**

**Бухгалтэрыі універсітэта фінансаваць камандзіровачныя расходы па арганізацыі дагаворнай кампаніі, а таксама закупку для студэнцкіх атрадаў канцылярскіх прыналежнасцей, матэрыялаў па нагляднай агітацыі для прапагандысцкай і шэфскай работы на месцах дыслакацыі атрадаў.**

**Праўленню студэнцкага клуба падрыхтаваць канцэртную брыгаду для выступлення ў ліпені-жніўні ў месцах дыслакацыі атрадаў.**

**Адміністрацыйна-гаспадарчай частцы забяспечыць дастаўку атрадаў да эшалонаў; у ліпені-жніўні прадаставіць транспарт агітацыйнай брыгадзе для паездкі па месцах дыслакацыі атрадаў, а таксама для праверкі прадстаўнікамі парткома і камітэта камсамола дзейнасці будаўнічых атрадаў.**

**Факультэту грамадскіх прафесій накіраваць у будаўнічыя атрады студэнтаў, якія займаюцца на аддзяленні лектараў, для правядзення агітацыйна-прапагандысцкай работы сярод мясцовага насельніцтва, і студэнтаў, якія займаюцца на аддзяленні піянерскіх важатых, для арганізацыі піянерскіх лагераў пры атрадах.**

**Кафедрам грамадскіх дысцыплін і таварыству «Веды» забяспечыць студэнцкія атрады метадычнымі матэрыяламі для вядзення агітацыйна - прапагандысцкай работы.**

**Лічыць важнай задачай камітэтаў камсамола, дэканатаў далейшае ўдасканаленне форм і метадаў навучання студэнтаў-будаўнікоў, стварэнне неабходных умоў для паспяховага выканання імі вытворчай праграмы і правядзення грамадска-палітычнай работы.**

**Працоўны семестр 1971 года ў гонар 50-годдзя БДУ лічыць ударным.**

